того, не был четко решен вопрос финансирования. Германия, например, была обеспокоена, что средства на новый проект будут идти из бюджета ЕС, наполнение которого в существенной степени зависит от нее. Этот вопрос был решен следующим образом. Учитывая, что в соответствии с уже существующими обязательствами Евросоюз на постоянной основе оказывал региону значительную поддержку, он не в состоянии был взять на себя дополнительное финансовое бремя. В связи с этим предполагалось, что финансирование проектов в рамках нового Союза не будет происходить исключительно за счет дополнительного финансирования со стороны частных инвесторов, помимо этого, проекты будут реализоваться и за счет общего бюджета ЕС, а также из бюджетов его стран-участниц [3].

Пытаясь стабилизировать сегодняшнюю ситуацию в Европе, которая имеет неприятные последствия (в частности, терроризм, потоки беженцев, ухудшение гуманитарной ситуации), Евросоюз обеспечивал собственную безопасность путем многопрофильной помощи государствам Юга Средиземноморья в целом и тем режимам, с которыми «можно работать», в частности.

Несмотря на различия в политических системах, экономическом развитии и культуре, некоторые сложности с взаимопониманием, сотрудничество между этими регионами имеет большое значение для достижения общих целей, а также для обеспечения стабильности, безопасности и процветания в мире.

Литература

1. Khader, B. Europa por el Mediterráneo. De Barcelona a Barcelona (1995–2009) / B. Khader. – Madrid, 2009.

2. Аникеева, Н. Е. Барселонский процесс: создание Союза для Средиземноморья / Н. Е. Аникеева // Ибероамериканские тетради. – 2017. – № 15. – С. 12–18.

3. Агапов, А. Союз для Средиземноморья: проблемы и противоречия / А. Агапов // Мировая экономика и международные отношения. – 2010. – № 9. – С. 66–71.

П. В. Баброўскі і яго праца «Греко-русская церковь в царствование Александра I»

Саўчанка А. В., асп. III к. БДУ,
навук. кір. дац. Паддубская А. Ф., канд. гіст. навук, дац.

Гістарыяграфія ўніяцкіх капітулаў у Беларусі прадстаўлена на сённяшні час у асноўным працамі даследчыкаў XIX – пачатку XX ст. Асаблівае месца сярод іх займае праца «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I» [2] Паўла Баброўскага.

Павел Восіпавіч паходзіў з сям'і ўніятаў, яго дзядзькам быў знакаміты лінгвіст, прафесар Віленскага ўніверсітэта, знаўца кананічнага права, удастоены звання благачыннага Міхаіл Баброўскі [4, с. 201–203]. Асоба Міхаіла Баброўскага, яго прафесійныя дасягненні сталі для пляменніка прыкладам і прадметам гонару.

П. Баброўскі падрыхтаваў да друку шэраг прац, у тым ліку «Михаил Кириллович Бобровский (1785–1848): Ученый славист-ориенталист» (1889); «Антоний Юрьевич Сосновский, старший соборный протоиерей, настоятель Св.-Николаевской церкви в Клещелях: (один из триумвиров Брестского капитула)» (1890); «К биографии Антония Юрьевича Сосновского: переписка в 1826, 1827 и 1828 годах» (1891); «Противодействие Базилианского ордена стремлению белого духовенства к реформам Русской греко-униатской церкви» (1889).

У кнізе «Греко-русская церковь в царствование Александра I» П. Баброўскі, не з'яўляючыся такім спецыялістам па гісторыі ўніяцтва, як Міхаіл Каяловіч[2], стаў даследаваць праблему знікнення ўніі пад іншым ракурсам: не асоба, а калектыўнае памкненне і інстытут (у дадзеным выпадку капітул) граюць галоўную ролю ў гістарычных працэсах. П. Баброўскі на аснове адкрытых дакументаў 2-га дэпартамента Рымска-каталіцкай калегіі і Міністэрства народнай асветы паспрабаваў паказаць, што прырода з'яўлення Указа Урадавага Сената ад 9 кастрычніка 1827 г., які фіксаваў патрэбу пацвярджэння IX і X пунктаў Указа ад 25.10.1807 г.[3] і трымання яго (забароны прымаць ва ўніяцкае манаства людзей іншага абраду; даваць прамаўляць абет толькі тым, хто валодае мовай славянскай (царкоўна-славянскай), ведае грэцкі чын богаслужэння; стварыць для навучання юнацтва грэка-ўніяцкага вучылішчы

[2] Міхаіл Каяловіч – магістр гістарычных навук, кандыдат багаслоўя, заслужаны ардынарны прафесар, заснавальнік праваслаўнай гістарычнай школы [Электронны рэсурс] // Анлайн-энцыклапедыя «Беларусь у асобах і падзеях». – Рэжым доступу: https://bis.nlb.by/ru/documents/129748. – Дата доступу: 3.03.2024.

[3] Закон Урадавага Сената № 22.659 ад 25.10.1807 г. змяшчаў у п. IX прадпісанне ваенным губернатарам уз'яднаных зямель: па-першае, каб яны споўнілі Высокую волю аб абавязковым вяртанні пад Уніяцкае духоўнае ўпраўленне тых уніятаў (святароў і прыхаджан), што перайшлі ў лацінскі (каталіцкі) абрад і спрыялі гэтаму; па-другое, каб калі хто захоча перайсці ў праваслаўе, то гэтаму садзейнічалі і дапамагалі; па-трэцяе, сачылі, каб вяртанне ўніятаў у рымскі абрад не рабілася не толькі праз прымус ці ўгаворы, але каб і добраахвотна жадаючых прыхаджан і святароў лаціняне (каталікі) да сябе не прымалі пад пагрозай пакарання [Полное собрание законов Российской империи. [Собрание 1-е. С 1649 по 12 декабря 1825 г.]. – СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1830. Т. 29 : 1806–1807 : [Закон № 22.659]. – 1830. – С. 1314].

Згодна з п. X прадпісвалася, каб усё лацінскае (каталіцкае) і ўніяцкае духавенства ўчыніла строгі наказ, што Высокія ўказы аб непераходзе з адной хрысціянскай веры ў іншую цярпімую адносяцца і да абраду ўніяцкага, і каб ніхто з аднаго з гэтых абрадаў у іншы не пераходзіў, а рымска-каталіцкае духавенства каб такіх жадаючых не прымала і ўніяцкае духавенства такога дазволу (на пераход) не давала пад пагрозай пакарання [Там же].

як у правілах веры, так і ў абрадах набажэнства на мове славянскай), з'яўляецца вынікам барацьбы іерархаў і выхадцаў з белага духавенства ад самага пачатку XIX ст., у тым ліку прыўнесенага ўкладу прадстаўнікоў Брэсцкага капітула[4] [2, с. 392–393].

Хоць канцэпцыя і погляды П. Баброўскага, выкладзеныя ім у яго абагульняючай працы, сталі аб'ектам крытыкі з боку прафесараў М. Каяловіча [3] і І. Філевіча [5], значэнне Паўла Баброўскага палягае таксама ў тым, што ён паспрабаваў асвятліць гісторыю фактычна мала прадстаўленага інстытута – капітула. Таксама Паўлу Баброўскаму трэба аддаць належнае, бо дзякуючы яго працы мы ведаем спіс сябраў Брэсцкага капітула [2, с. 128; 4, с. 63], якому ў барацьбе за рэформу і кіраўніцтва ў царкве Павел Восіпавіч прысвяціў некалькі раздзелаў сваёй кнігі. Менавіта Паўлам Баброўскім выяўлена лічба пераходаў уніятаў у каталіцтва, нягледзячы на забарону згодна з указам 1804 г., калі з 1805 па 1814 гг. у рымскі (каталіцкі абрад) перайшло амаль 20 000 уніятаў [4, с. 51], а агулам за 1803–1828 гг. Уніяцкая царква страціла за кошт пераходу ў каталіцтва не менш за 200 000 вернікаў [2, с. 21]. Павел Воспіавіч пацвердзіў тэзіс пра панаванне польскай мовы ў асяроддзі ўніятаў, бо менавіта гэты факт абумовіў друк для заходніх губерняў такіх кніг, як Біблія, малітвасловы і падручнікі, азбучнікі па-польску [2, с. 120, 127; 4, с. 34]. У яго працы паказвалася фінансавая розніца ўтрымання базыльян і простага святарства (на аднаго бяздзетнага манаха-базыяльяніна затрачвалася 1 360 рублёў[5] і 77 рублёў на прыхадскога святара) [2, с. 170; 4, с. 61] і многія іншыя факты.

Літаратура

1. Бобровский, П. О. Ответ на критику г. Кояловича по поводу сочинения: «Русская греко-униатская церковь при Александре I» / П. О. Бобровский. – Санкт-Петербург : Типография В. С. Балашева, 1890. – 30 с.

---

[4] Капітул у Брэсце павінен быў функцыянаваць пры ўніяцкай царкве, але з пэўнага моманту (прыблізна др. палова XVII ст.) ён спыніў існаванне, пасля чаго двойчы (у др. палове XVIII і пачатку XIX ст.) аднаўляў сваю дзейнасць на падставе двух дакументаў – Граматы Брэсцкага епіскапа А. Младоўскага ад 17.05.1775 г. [Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 823. Воп. 2. Спр. 2155. С. 1, 1 аб, 2, 2 аб, 3, 3аб, 4, 4аб, 5, 5 аб, 6] і Граматы мітрапаліта Уніяцкай царквы ў Расіі Я. Булгака ад 2.07.1809 г. [РДГА. – Ф. 823. Воп. 2. Спр. 1443. С. 4, 4аб, 5, 5аб., 6, 6 аб., 7, 7 аб].

[5] Якраз фактар наяўнасці грошай прыводзіў да разбэшчанасці нораваў сярод базыльян, калі ў палдужных спісках базыльян маглі быць такія прыпіскі, як «п'яніца, схільны да чужаложства (руск. – прелюбодеяния)» ці «п'яніца беспаваротны», «п'яніца і няздатны» [4, с. 61]. Ішло сведчанне пра праблему маральнага стану ў базыльян па лініі рапартаў. Так, напрыклад, правінцыял Рамановіч у 1809 г. пісаў, што многіх манахаў ужо не выправіць: здаўна яны ў дурных звычках [4, с. 61–62].

2. Бобровский, П. О. Русская греко-униатская церковь в царствование Александра I / П. О. Бобровский. – Минск : Энциклопедикс, 2014. – 412 с.

3. Коялович, М. О. Разбор сочинения П. О. Бобровского: «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I. Историческое исследование по архивным документам» и указание на основании архивных документов иной постановки всех главных униатских вопросов того времени / М. О. Коялович. – СПб., 1890. – 71 с.

4. Носко, М. (протоиерей). Униатская церковь в первой трети XIX века : движение к воссоединению с Православием / протоиерей М. Носко ; [науч. ред. В. Теплова]. – Минск : Свято-Елисаветинский женский монастырь в г. Минске, 2014. – 204, [19] с. : табл., портр., факсим.

5. Филевич, И. Вопрос о воссоединении западнорусских униатов в его новейшей постановке: по поводу исследования П. О. Бобровского «Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I» / И. Филевич. – СПб., 1890. – Варшава, 1891. – 31 с.

Спортивная дипломатия Бразилии в XXI в.

Селюк У. Ю., студ. II к. БГУ,
науч. рук. Ковяко И. И., канд. ист. наук, доц.

Говоря об актуальности темы исследования, можно сказать, что Бразилия, являясь одним из крупнейших игроков на международной арене, не может обойти тенденцию развития такого направления дипломатии, как спортивная дипломатия. В нынешних международных условиях чрезвычайно важно находить новые точки соприкосновения с другими странами и создавать благоприятную обстановку.

Особое место в данном исследовании отведено такому виду спортивной дипломатии, как футбольная дипломатия, ведь футбол является одним из основных символов Бразилии и бразильской культуры. Чемпионаты, олимпиады, бесчисленное множество соревнований уже долгие годы проводятся на территории Бразилии. Бразилию многие по праву считают родиной футбола и одним из ее символов отмечают именно спорт. Налаживая связи с другими странами и способствуя продвижению имиджа Бразилии, спорт стал важным инструментом дипломатии в XXI веке.

В Бразилии футбольная дипломатия, созданная правительством Луиса Инасиу Лулы да Силвы, представляет собой основную концепцию идеологии, присутствующей в спортивной дипломатии страны, учитывая, что бразильский футбол представляет собой одновременно создание национальной идентичности Бразилии и ее разностороннюю натурализацию как развивающейся страны в мире [1, с. 10]. Бразильский дипломат Роберту Ягуарибе выразился, что «лучшим послом Бразилии является футбол».